опыт духовного восхождения, задает направление и пути нравственного совершенствования и самореализации.

1. *Насевіч, В.* Завішы / В. Насевіч // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – Т. 1 : Абаленскі – Кадэнцыя. – 688 с.

2. *Грыцкевіч, А.* Тышкевічы / А. Грыцкевіч // Вялікае Княства Літоўскае : энцыкл. : у 2 т. / рэдкал.: Г. П. Пашкоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2007. – Т. 2 : Кадэцкі корпус – Яцкевіч. – 792 с.

3. Ляденский Благовещенский мужской монастырь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://monasterium.by/monastyri-belorusskoy-pravoslavnoy-tserkvi/borisovskaya_eparkhiya/lyadenskiy-svyato-blagoveshchenskiy-muzhskoy-monastyr. – Дата доступа: 25.03.2016.

К. А. ЛАПОТКА

## ТРАДЫЦЫІ МЕЦЭНАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВІНЦЭНТА ТЫШКЕВІЧА Ў СПРАВЕ ПАДТРЫМАННЯ ТЭАТРАЛЬНАГА МАСТАЦТВА

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Палітычныя падзеі XVIII ст. (у выніку трох падзелаў Рэчы Паспалітай Беларусь была далучана да Расіі) наклалі адбітак не толькі на сацыяльна-эканамічныя працэсы, але і на культурнае жыццё. У гэты час адзначаецца ўзнікненне новага тыпа тэатра, які называюць прыгонным, альбо маёнткавым.

Тэатральнае жыццё таго часу характарызавалася шырокім распаўсюджаннем пастановак школьнага тэатру. Але к канцу XVIII ст. такія пастаноўкі ўжо не мелі былой папулярнасці. Даследчыкі гісторыі тэатра Беларусі адзначаюць, што прыгонны тэатр з’яўляецца больш якасным ў параўнанні са школьным. Але спектаклі ў школах і гімназіях працягвалі ставіцца на вялікія святы і вызначаліся маральна-павучальным характарам.

Перадумовай узнікнення прыгонных тэатраў з’яўляецца ўздым эканомікі. Але гэта можна сказаць толькі ў дачыненні да крупных магнатаў. Вялікія зямельныя ўладанні буйных памешчыкаў і магнатаў, дзе працавалі залежныя сялене, прыносілі вялікі даход. Менавіта гэтыя вялікія грашовыя прыбыткі і дазволілі заводзіць магнатам уласныя тэатры па прыкладу царскага двара.

Доўгі час прыгонныя тэатры не мелі абмежаванняў з боку ўлады. Тэатральнае мастацтва даволі свабодна развівалася, не мела жорсткіх перашкод. Тэатры падпарадкоўваліся палажэнням самага агульнага характару. Даследчык С. С. Данілаў у сваёй кнізе «Очерки по истории русского драматического театра» адзначае, што Кацярынай II быў выдадзены ўказ у 1783 г. «Аб заснаванні асобнага камітэта для кіравання тэатральнымі відовішчамі і музыкай», які абвяшчаў: «Дазваляецца кожнаму заводзіць добрапрыстойныя для публікі забавы, прытрымліваючыся толькі дзяржаўных законаў і прадпісанняў у статуце паліцэйскім» [3, с. 222].

Даследчыкі робяць выснову, што такая свабода ў тэатральным жыцці была абумоўлена тым, што тэатры ў той час былі ў асноўным аматарскія, уласныя (таксама іх можна характарызаваць як закрытыя) і забяспечвалі культурныя патрэбы толькі сваіх уладальнікаў.

У выданні «Гісторыя беларускага тэатра», які складаецца з трох тамоў, адзначаецца, што «маёнткавы тэатр Беларусі меў, як правіла, лакальны, закрыты характар, трупы яго не вызначаліся высокім прафесіяналізмам, паказы былі дамарослыя па форме» [2, с. 179]. Але на гэтым усё не спынілася. Магнаты рабілі спробы перасягнуць адзін аднаго і таму стала звычайнай справай запрашаць кампазітараў, музыкантаў, харэографаў з-за мяжы. Існуюць пэўныя прыклады, калі магнаты прывозілі цэлыя трупы з Італіі, Францыі, Аўстрыі і іншых краін. Заключаліся кантракты з артыстамі, і асноўным пунктам было тое, што яны павінны навучыць прыгонных сялян музыцы, спевам або танцам. Гэта спрыяла развіццю мастацтва і культурнага жыцця, але асноўнай прычынай быў танны кошт прыгонных артыстаў у параўнанні з замежнымі.

Такім чынам, на Беларусі працавалі і дзяліліся ведамі такія знакамітыя творцы, як вучань Вальтэра Т. А. Г. дэ Салмаран, вучань Канта І. Л. Стэфані, балетмайстры Л. М. Дзюпрэ, Ф. Г. Ле Ду, кампазітары К. Абатэ і К. Чыпрыяна і г. д. Апошні з іх быў запрошаны графам Вінцэнтам Тышкевічам працаваць у Свіслач і займаў пасаду капельмайстра. З гэтага вынікае, што прыгонны тэатр пачынаў сваё развіццё на аматарскай аснове і меў прымітыўны характар, але вялікія грашовыя магчымасці дазволілі дасягнуць высокага прафесійнага ўзроўню.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Асноўнымі жанрамі мастацтва, якія мелі найбольшую папулярнасць у прыгонна-маёнткавых тэатрах, былі опера, балет, драма атрымала меншае распаўсюджанне. У прадмове да «Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружаны» А. Філатава адзначае, што ў асноўным рэпертуар складаўся з твораў камедыйнага жанру, такіх, як опера-буф, камічная опера [6]. Рэпертуар уключаў творы на нямецкай, італьянскай, французскай мовах, што было абумоўлена свабодным успрыманнем замежнай мовы ў маёнтках магнатаў. Менавіта гэта таксама паўплывала на запрашэнне замежных артыстаў.

Што тычыцца ўмоў тэхнічнага характару, то спектаклі маглі ставіцца як у маёнтках магнатаў, дзе пад гэта было выдзелена памяшканне, так і ў асобных будынках. Мала хто мог сабе дазволіць асобны будынак, каб выкарыстоўваць яго толькі для спектакляў і імпрэз, тым не менш, гісторыя мае такія прыклады. Князі Радзівілы пабудавалі новы тэатр у Слуцку. Добра вядомы тэатр М. К. Агінскага, які быў абсталяваны па апошняму слову тэхнікі. Граф А. Тызенгаўз таксама дазволіў сабе новы тэатр. У гэты спіс уваходзіць і граф Вінцэнт Тышкевіч.

Гісторыя захавала шмат інфармацыі пра прыгонныя тэатры найбольш буйных магнатаў на Беларусі. На жаль, не так многа дайшло да нас звестак пра тэатр графа В. Тышкевіча. Вядома, што ў Тышкевіча былі тэатры ў Свіслачы і Плешчаніцах. Датай заснавання свіслацкага тэатра лічыцца 1788 г.

Некаторую інфармацыю мы можам атрымаць з успамінаў Л. Патоцкага, якія ўтрымліваюцца ў кнізе «Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружаны». Як адзначае А. Філатава ў прадмове да гэтага выдання: «Мемуары заўсёды былі вельмі каштоўнай крыніцай для даследчыкаў – гісторыкаў, літаратараў, мастацтвазнаўцаў. Дзякуючы ім мы можам пагля-дзець на жыццё іншых часоў вачыма іхных сучаснікаў. Вядома, што гэта позірк суб’ектыўны, але адносінаў да людзей, учынкаў, некаторых падзей, адпаведнага настрою не знойдзеш ва ўсіх архіўных дакументах» [6, с. 6]. Гэты твор з’яўляецца крыніцай ведаў пра Свіслач таго часу, тым не менш, мы маем некаторую інфармацыю, на аснове якой мы можам зрабіць пэўныя высновы.

Ва ўспамінах Л. Патоцкага прыводзіцца пералік месцаў, якімі валодаў граф Вінцэнт Тышкевіч, ён быў «…уладальнікам



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Свіслачы ў губ. Гродзенскай, Лагойска ў губ. Мінскай і Белаполя на Украіне. Першы з гэтых маёнткаў даваў 10 000 чырвоных злотых гадавога даходу, другі 5000, трэці столькі ж, колькі і першы. Дадаўшы сюды мільён польскіх злотых, пакладзены на працэнты ў кн. Радзівіла, Нясвіжскага ардыната, ён мог называцца багатым» [6, с. 28]. Л. Патоцкі робіць выснову аб фінансавых магчымасцях графа, які мог утрымліваць прыгонны тэатр і развіваць тэатральнае мастацтва.

Таксама з успамінаў мы дазнаемся пра асобу графа. Л. Патоцкі піша наступнае: «…дабрачыннасць стала для яго патрэбаю жыцця, а добрыя ўчынкі хлебам надзённым» [6, с. 29], а потым дадае: «Абыякавым вокам паглядаў ён на павароты тагачаснай палітыкі і на тое, што рабілася на вялікім свеце. Ён быў заняты адзіна ўпарадкаваннем сваіх абшырных уладанняў, забеспячэннем добрага быту падданым і паляпшэннем сваёй улюблёнай рэзідэнцыі» [6, с. 30]. З гэтага вынікае, што граф Тышкевіч, акрамя таго што валодаў багаццем, быў сапраўдным гаспадаром і не шкадаваў грошай на ўдасканаленне месца, у якім жыў.

Як мецэнат В. Тышкевіч праявіў сябе не толькі ў справе паляпшэння жыццёвых умоў, але і ў справе развіцця тэатральнага мастацтва ў Свіслачы. Звесткі пра тэатр ва «Успамінах» Л. Патоцкага мы сустракаем на 34 старонцы, дзе размова ідзе пра кірмаш, які штогод ладзіўся ў жніўні і доўжыўся па два тыдні. Тут мы сустракаем наступную інфармацыю: «…звычайна ў ранішні час пан рэферэндарый рабіў візіты дамам і запрашаў да сябе. Штодзённы абед у яго на сто асобаў збіраў усіх. Пасля абеду рабілі выезды карэтамі або плавалі па каналах. Наступаў час тэатру, а пасля яго ў пэўны дзень публічны касцюмаваны баль ў горадзе, у іншы ж час – баль ў двары. … Пані рэферэндарыня Тышкевіч у час свайго нядоўгага побыту ў Свіслачы арганізавала прыгожы і элегантны тэарык, у якім з адабранай групай аматараў разыгрывала французскія п’есы. Народная ж мова, у тую эпоху выгнаная з модных салонаў, захоўвалася толькі па шляхецкіх дамах. Адчыніў ёй свае дзверы нанова муж, пакінуты жонкаю, бо тая, ад’язджаючы ад яго, забрала з сабою тое, што было моднае, чужое, нясвойскае. Пазней гэта самая тэатральная зала была прызначана для кірмашовых драматычных артыстаў» [6, с. 34]. Як мы можам бачыць,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тэатр у Свіслачы, як і ў іншых маёнтах, пачынаўся з аматарскіх пастановак, а пазней дасягнуў прафесійнага ўзроўню. Па прыкладзе іншых магнатаў В. Тышкевіч запрасіў да сябе на працу скрыпача і кампазітара К. Чыпрыяна. Гэты майстар таксама працаваў у М. К. Агінскага, а потым з 1775 г. у Ружанах у тэатры Сапегаў, пасля чаго ў 1778 г. заняў пасаду капельмайстра ў тэатры В. Тышкевіча, дзе таксама з гастролямі выступалі трупы, якія можна лічыць прафесійнымі. Напрыклад, энцыклапедыя «Гісторыя беларускага тэатра» змяшчае інфармацыю аб тым, што ў Свіслацкім тэатры выступалі трупы Я. Шыманскага (1803), віленскага тэатра пад дырэкцыяй М. Кажынскага (1817–1819) [2, с. 211].

Сведчаннем непасрэднага праяўлення Тышкевіча ў якасці мецэната з'яўляецца тое, што ўсе прафесійныя трупы, якія бывалі ў Свіслачы, граф Тышкевіч браў на сваё ўтрыманне і плаціў ім грошы [2, с. 211]. У кнізе «Тэатр польскі на Літве (1784–1906)» В. Руліkоўскі піша, што Тышкевіч не толькі плаціў грошы, але яшчэ «даваў некаторыя каштоўныя прэзенты, за што яны павінны былі ставіць п'есы і нічога не патрабаваць ад публікі» [8, с. 14]. І зноў з «Успамінаў» Л. Патоцкага мы даземся, што ў час правядзення кірмаша, граф мог бясплатна раздаваць квіткі на спектаклі праваслаўным купцам.

Прыгонныя таэтры на Беларусі існавалі амаль цэлае стагоддзе. Як адзначае даследчык гісторыі беларускага тэатра У. І. Няфёд, у канцы XVIII ст. прыгонна-ўласныя тэатры спынілі сваю дзейнасць. Прычынай была адсутнасць дастатковых сродкаў, неабходных для іх утрымання [5, с. 48]. У пачатку XIX ст. спыніў дзейнасць і тэатр В. Тышкевіча. Апошнія звесткі пра тэатр у Плешчаніцах дае В. Рулікоўскі. Ён піша, што тэатр «меў некалькі камплектаў прывезеных з Варшавы дэкарацый, зробленых з вялікім густам, і каштоўны гардэроб…», у 1830-х гг. закрыўся, а яго «…маёмасць была перададзена мінскаму тэатру, пасля таго як працаваўшыя там артысты пацярпелі страты ад пажару ў 1835 г.» [8, с. 15].

Так скончылася гісторыя мецэнацкай дзейнасці графа Вінцэнта Тышкевіча ў справе тэатральнага мастацтва. Гэта яркі прыклад падтрымання культуры, які застаўся ў гісторыі. Але з цягам часу традыцыі адраджаюцца і працягваюць падтрымлівацца. Сёння мецэнацкая дзейнась мае новы этап развіцця.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Распаўсюджанай практыкай становіцца падтрыманне буйнымі, багатымі арганізацыямі і безнесменамі культурных праектаў. Стасункі мецэнатаў і спонсараў з суб'ектамі культуры, у працэсе сумеснай працы над праектамі ў сферы культуры, у сучасных умовах набываюць іншыя формы. Тым не менш, гэта стымулюе культурнае жыццё і спрыяе развіццю культры і мастацтва.


1. *Барышев, Г. И.* Театральная культура Белоруссии XVIII века / Г. И. Барышев. – Мінск : Навука і тэхніка, 1992. – 293 с.

2. Гісторыя беларускага тэатра : у 3-х т. / рэдкал.: У. І. Няфёд (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Навука і тэхніка, 1983–1987. – Т. 1. Беларускі тэатр ад вытокаў да Кастрычніка 1917 г. / рэд. Г. І. Барышаў, А. В. Сабалеўскі . –1983. – 496 с.

3. *Данилов, С. С.* Очерки по истории русского драматического театра / С. С. Данилов. – М., Л. : Искусство, 1948. – 588 с.

4. *Няфёд, У. І.* Беларускі тэатр / У. І. Няфёд. – Мінск : Выд-ва АН БССР, 1959. – 399 с.

5. *Няфёд, У. І.* Гісторыя беларускага тэатра : вучэб. дапаможнік для тэтр.-маст. ін-та / У. І. Няфёд. – Мінск : Выш. шк., 1982. – 543 с.

6. *Патоцкі, Л.* Успаміны пра Тышкевічаву Свіслач, Дзярэчын і Ружаны / Л. Патоцкі ; укл., прадмова, камент. А. М. Філатавай ; пер. з пол. І. У. Саламевіча. – Мінск : Полымя, 1997. – 270 с.

7. *Смольскі, Р. Б.* На скрыжаванні: Тэатр у працэсах станаўлення і развіцця гістарычнай і нацыянальнай свядомасці беларусаў / Р. Б. Смольскі. – Мінск : Беларус. навука, 1999. – 231 с.

8. *Rulikowski M.* Teatr Polski na Litwie (1784–1906) / M. Rulikowski. – Wilno. – «Kurjera Litewskiego», 1907. – 107 p.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Г. А. КАРПЕЧЭНКО

## СТАНАЎЛЕННЕ БІРЖАНСКАЙ АРДЫНАЦЫІ ТЫШКЕВІЧАЎ

Зараз у беларускай навуке з прадстаўнікоў шматлікага роду Тышкевічаў больш даследаваны браты Канстанцін і Яўстах. Цікавасць навукоўцаў прыцягваюць і іх музеі ў Лагойску і Вільна. Аднак у XIX ст. шырокую вядомасць набылі і іншыя прадстаўнікі гэтага роду – генерал Тадэвуш Тышкевіч, палкоў-